# МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

220004 г. Мінск, праспект Пераможцаў, 11, тэл. (017) 203 75 74, факс 203 90 45

## ДАЗВОЛ
## на выкананне навукова-даследчых і праектных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях ад 28 студзеня 2019 г. № 04-01-07/63

Дазвол сапраўдны да 31.12.2019 г.

У адпаведнасці з артыкулам 115 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры дазвол выдадзены СТАА "ДемсаГрупп"

| | |
|---|---|
| на правядзенне навукова-даследчых і праектных работ | па рэканструкцыі памяшканняў у будынку № 1 па вул. Савецкай у складзе |
| матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі "2" | "Забудова вул. Савецкай" (XVI-XX стагоддзі) у г. Гродна. |

Асобыя ўмовы:

дазвол выдадзены на працяг работ (дазвол ад 29.05.2018 № 04-01-07/223) з улікам справаздачы кіраўніка распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі Шэйко С.Л. (пасведчанне ад 08.06.2017 № 11-01-02/35);

распрацоўку навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ ажыццяўляць пад кіраўніцтвам грамадзяніна (у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка), які мае пасведчанне на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі (п. 1 артыкула 116 названага Кодэкса);

прымаемыя навукова і метадычна абгрунтаваныя праектныя рашэнні павінны прадугледжваць безумоўнае захаванне адметных вартасцей (дэкаратыўных і іншых каштоўных архітэктурных элементаў гісторыка-культурнай каштоўнасці), што прадугледжана палажэннямі артыкулаў 103, 104 Кодэкса;

работы выконваць на падставе матэрыялаў навукова-даследчых работ, якія ўключаюцца ў склад навукова-праектнай дакументацыі (п. 2 артыкула 112 Кодэкса);

выключыць уладкаванне на фасадах аб'екта спадчыны актыўных дысаніруючых (не характэрных) элементаў, інжынернага і іншага абсталявання;

прадугледзець захаванне або аднаўленне гістарычнай формы, матэрыялу, малюнка і колеру сталярных вырабаў;

праектныя рашэнні, якія могуць прывесці да навукова неабгрунтаваных (не пацверджаных комплекснымі навуковымі даследаваннямі) змяненняў архітэктурнага аблічча гісторыка-культурнай каштоўнасці, пагаршэння візуальных ўмоў яе ўспрымання і страты адметных вартасцей, не могуць быць узгоднены;

прадставіць навукова-праектную дакументацыю на ўзгадненне ў Міністэрства культуры згодна з артыкулам 119 Кодэкса;

для атрымання дазволу на працяг работ прадставіць у Міністэрства культуры справаздачу аб выкананых работах за папярэдні год, падрыхтаваную асобай, на якую ўскладзены абавязак кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыяй;

пасля завяршэння рамонтна-рэстаўрацыйных работ згодна з артыкулам 120 Кодэкса атрымаць заключэнне Міністэрства культуры аб адпаведнасці прымаемай у эксплуатацыю гісторыка-культурнай каштоўнасці, распрацаванай і ўзгодненай навукова-праектнай дакументацыі ў парадку, прадугледжаным п. $3.25^2$ пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 лютага 2012 г. № 156.

Матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць катэгорыі "2" — "Забудова вул. Савецкай" (XVI-XX стагоддзі) у г. Гродна пад шыфрам 412Г000665 уключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 3 верасня 2008 г. № 1288 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2008 г., № 222, 5/28291).

Намеснік Міністра С.І.Шарамецьеў

04 Чарняўскі 200 11 36